Бел. 2421964
Бел. аддзел
1994 г.
B0000002734286
Ба 14558
Інв. 1953 г. БА 14558
Бел. аддзел
1994 г.
БССР
Бібліятэка імені Леніна

# ПАЛАЖЭНЬНЕ

## АБ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫЦЫ СТУДЭНТАЎ АГРАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТУ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ АКАДЭМІІ С. Г.

ГОРКІ
ДРУКАРНЯ АКАДЭМІІ
1928

25.04.2009

Ба 14558

Зацьверджана паседж. дэканату аграфаку 21/II-1928 г.

# ПАЛАЖЭНЬНЕ

## аб вытворчай практыцы студэнтаў аграна-мічнага факультэту Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі С. Г.

1. Мэтаю вытворчай практыкі студэнтаў-аграномаў зьяўляецца іх азнаямленьне з с.-г. сапраўднасьцю. Наглядаючы і вывучаючы с.-г. вытворчасьць, практыкант вывучаецца дапасоўваць у ім свае тэарытычныя веды і здабывае, неабходныя ў сваёй спэцыяльнасьці, навыкі.

2. Вытворчая практыка адбываецца на III курсе і абавязкова для ўсіх студэнтаў аграфаку.

Працягласьць яе ўстанаўліваецца з 1-га мая па 1-ае кастрычніка.

3. Месцамі адбываньня вытворчай практыкі могуць быць: саўхозы, калхозы, камуны агравучасткі (па вывучэньню сялянскай гаспадаркі), вучэбныя фэрмы і гаспадаркі Акадэміі, дасьледчыя станцыі і інш.

4. Кожнаму студэнту прызначаецца аграфакам месца адбываньня практыкі, куды ён

абавязан прыбыць к 1-му мая. Застаўленьне практыкі ці перамена прызначанага месца, без ведама аграфаку, не дапушчаецца.

5. Справаздача аб вытворчай практыцы прадстаўляецца дэканту аграфаку на працягу першага трымэстру чацьвёртага курсу.

6. К адбываньню вытворчай практыкі дапушчаюцца студэнты, якія выканалі ўсе зімовыя і летнія практычныя заняткі па вучэбнаму пляну першых трох курсаў (за выключэньнем тых, якія аднесяны на IV курс).

# ІНСТРУКЦЫЯ

для студэнтаў, якія адбываюць вытворчую практыку на Агравучастках (па вывучэньню сялянскай гаспадаркі).

1. Па прыезьдзе на месца, практыкант перш за ўсё павінен азнаёміцца з арганізацыяй і абсталяваньнем Агравучастку і работай аграпэрсанала.

2. Потым практыкант прыступае к самастойнаму вывучэньню агравучастку, даступнымі ў даным выпадку спосабамі і ў той час прыймае магчымы ўдзел у бягучай працы аграпэрсанала.

3. Вывучэньне агравучастку павінны ахопліваць наступныя пытаньні.

1. Прастора агравучастку: месца знаходжэньня, граніцы, насельніцкія пункты, іх разьмер і г. д.

2. Натуральна-гістарычныя умовы і іх узаемная сувязь: а) глеба, з боку яе фізыка-хэмічных уласьцівасьцяў і рэльефа, паверхоўна, у зьвязку з палажэньнем грунтовых вод і натуральных і штучных вадазбораў (рэк, ручаёў, азёр, сажалак і калодзежаў), б) клімат, адносна ападкаў (зімовых і лет-

ніх) тэмпэратура (гадовых месячных) і ветраў у зьвязку з уплывам іх на вэгэтацыйны пэрыяд сельска-гаспадарчай работы, тэхніку, культур, працяжнясьць пастбішчнага пэрыяду і г. д. (у выніках жадана складаньне сельска-гаспадарчага каляндара), в) флёра і фаўна сельска-гаспадарчага значэньня.

3. Грамадзка-эканамічныя умовы:

а) рынначае становішча аграучастку: назва галоўных і другарадных рынкаў, шляхі зносін з рынкамі (зімой і летам), адлегласьць, цэны на галоўнейшыя сельска-гаспадарчыя прадукты і сродкі вытворчасьці (прадажныя і пакупныя. Жадана па часу году). Галоўныя прадукты, якія прадаюцца і пакупаюцца сялянамі, б) прамысловасьць і промыслы насельніцтва (фабрыкі, заводы, сувязь іх з сялянскім насельніцтвам, адхожыя промыслы, наём рабочай сілы, умовы найма і г. д.) в) каапэраванасьць насельніцтва, віды каапэрацыі, % каапэраваньня насельніцтва, агульнае значэньне і становішча каапэрацыі ў аграучастку і г. д. г) культурна-бытавыя умовы: пісьменнасьць, сьвяты, хаты-чытальні, сельска-гаспадарчыя гурткі і інш.

4. Сельска-Гаспадарчая характарыстыка аграучастку:

а) Формы землякарыстаньня і землязабесьпячэньне насельніцтва, арэнда зямлі, умовы арэнды і інш;

б) склад і суадносіны ўгодзьдзяў.

в) склад, становішча, значэньне і напрамак галін земляробства (паляводзтва, характарыстыка складу, культур, севазваротаў і інш., лугаводзтва, садоўніцтва і гародніцтва) і жывёлагадоўлі (рабочага і прадукцыйнага) іх прадукцыя (ураджай, удоі і інш.) у сувязі з с.-г. тэхнікай па выраблeньню культур і ўтрыманьню жывёл.) На апошняе, г. зн. сувязь прадукцыі з с. г. тэхнікай, належыць зьвярнуць асаблівую ўвагу і вывучыць магчыма паўней у розных тыпах гаспадаркі).

У астатнім выніку практыкант павінен выявіць напрамак усей сельскай гаспадаркі і пэрспэктывы яе разьвіцьця ва ўсім аграучастку альбо ў асобных частках яе, калі яны рэзка адрозьніваюцца адна ад другой.

5. Сувязь сялянскай гаспадаркі з саўхозамі, калхозамі і аграпунктам. Спагадлівасьць насельніцтва да аграпрапаганды, укараненьне новых прыёмаў сельск. гаспадаркі і г. д.

6. Для арганізацыйна-вытворчага вывучэньня сельскай гаспадаркі, практыкант павінень зрабіць агра-бюджэтнае апісаньне. 3 гаспадарак (бедняцкага, серадняцкага і буйнага) па праграме, складзенай катэдрай сельска-гаспадарчай эканоміі.

7. Практыканту, з першага жа дню пры-

быцьця на агравучастак рэкамэндуецца весьці дзеньнік, у якім ён коратка адзначае ўсё, што яму прыходзіцца наглядаць і чым прыдзецца займацца па прадмету практыкі.

8. У прадстаўляемай справаздачы практыкантам павінны быць указаны: 1. агульныя умовы правядзеньня практыкі, 2. удзел практыкантаў у бягучай працы аграпэрсанала і 3. сыстэматызаваныя і прааналізаваныя дадзеныя па самастойнаму вывучэньню агравучастку. К справаздачы належыць прылажыць: 1. аграбюджэтныя апісаньні 3 сялянскіх гаспадарак і 2. дзеньнік у чарнавіку. Першыя перадаюцца ў габінэт с.-г. эканоміі, другія пасьля практыкі зварочваюцца аўтару.

# ІНСТРУКЦЫЯ

## для студэнтаў агранамічнага факультэту Беларускай Дзяржаўнай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, якія адбываюць вытворчую практыку ў гаспадарках.

1. Па прыбыцьці на месца практыкант павінен перш за ўсё азнаёміцца з агульнымі асновамі арганізацыі данай гаспадаркі і спосабам яго кіраваньня.

2. Затым практыкант прыступае к самастойнаму досьледу гаспадаркі, у той жа час падрабязна знаёміцца з дапасаванай у гаспадарцы тэхнікай.

3. Вывучэньне гаспадаркі належыць пачаць з азначэньня, дaступным ў данным становішчы спосабамі, натуральна-гістарычных умовах гаспадаркі і іх узаемнага суадносшаньня, як-та: а) глебы з боку яе фізыка-хэмічных уласьцівасьцяў і рэльефа паверхні, у сувязі з палажэньнем грунтовых вод і натуральных альбо штучнх вадаёмаў рэк, ручаеў, вазёр, сажалак і калодзажаў), б) клімату паскольку для яго маецца дадзеныя ў гаспадарцы, ці бліжэйшым к нему раёне—у відзе лі мэтэаралягічных назіраньняў, ці

запісаў аб пачатку і сканчэньні палявых работ, часу пасева і ўборкі вядомых расьлін, працягласьці пастбішчнага пэрыяду і г. д.

4. Пры вывучэньні эканамічных умоў гаспадаркі неабходна зьвярнуць увагу, галоўным чынам, на наступныя абставіны:

а) становішча гаспадаркі адносна рынку і шляхаў зносін. Жадана азначыць, хаця прыблізна, цыфрамі адлегласьць да бліжэйшай чыгуначнай станцыі, ці сплаўнай, ці судаходнай ракі, ці горада (мястэчка), калі гэткі служыць, ці можа служыць рынкам для якіх-небудзь прадуктаў гаспадаркі, а таксама і кошт дастаўкі да гэтых пунктаў розных прадуктаў.

б) Умовы забесьпячэньня рабочай сілай, г. зн.: а) насялённасьць мясцовасьці і заняцьце вакольнага насельніцтва наогул і ў прыватнасьці—гаспадарчыя умовы бліжэйшых сёл і вёсак, якія забясьпечваюць гаспадарку рабочай сілай, б) умовы і кошт найма часовых і сталых рабочых, в) ці практыкуецца, і калі да, дык на якіх умовах, наём прышлых рабочых, г) спосаб утрыманьня сталых і часовых рабочых д) умовы і значэньне для гаспадаркі зьдзельнага спосабу выкананьня работ.

в) Тэрыторыя гаспадаркі, яе фігура і становішча сядзібы адносна граніц, выгады і нявыгады данага становішча.



г) Капіталы гаспадаркі. Стасунак розных відаў капіталу друг да друга і к тэрыторыі гаспадаркі наогул, а затым стасунак паміж капіталамі розных гаспадарчых галін.

Спосабы ацэнкі і вучоту розных капіталаў і пагашэньня асноўнога капітала.

д) Культурна-гаспадарчая ўзаемасувязь гаспадаркі з вакольным сялянскім насельніцтвам і аграпунктам.

Практыкант павінен асноўваць усе сваі меркаваньні аб гаспадарцы, галоўным чынам, на асабістых нагляданьнях, а не на паведамленьнях канторы ці служачых гаспадаркі.

Таму-то зьмяшчэньне ў справаздачы вучотаў даходнасьці асобных культур, узятых з кніг гаспадаркі, і не магчымых быць праверанымі ці па спосабу складаньня прызнаваемых практыкантам не здавальняючымі—не прадстаўляюць ніякага інтарэсу.

Практыканту, з першага жа дню прыбыцьця ў гаспадарку, рэкамэндуецца весьці дзеньнік, у якім ён коратка адзначе ўсё што яму прыходзіцца наглядаць і чым прыходзіцца займацца. Дзеннік гэты прадстаўляецца ў дэканат у чарнавіку і сьледам чаго падлягае звароту аўтару.

# ІНСТРУКЦЫЯ

## для студэнтаў аграфаку Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі, якія адбываюць вытворчую практыку на дасьледчых станцыях

Практыканты знаёмяцца: 1. з арганізацыяй станцыі, а іменна: а) з папярэднімі дасьледамі, якія вытвораны на тэрыторыі станцыі глебавымі, батанічнымі работамі па нівіліроўцы вучастку, рэкагносьціровачнымі пасевамі, б) з арганізацыяй тэрыторыі станцыі: разьмяшчэньне дасьледчых севазваротаў, досьледы на дробных дзялянках (запольныя вучасткі), калякцыйныя гадавальнікі, в) з мэтодыкай пастаноўкі палявога досьледу, прынятага на станцыі: велічыня і форма дзялянак, абаронныя і прамежныя палосы, паўторнасьць досьледаў, вучот ураджаю (па пробнаму снапу) вучот рэкагнасьціровачнага пасеву, матэматычная апрацоўка ўраджайных даных г) з мэтодыкай пастаноўкі вегэтацыйных досьледаў, д) з мэтадамі, практыкуемымі і намечаемымі станцыяй дзеля ўстанаўленьня сувязі з сялянскімі гаспадаркамі і спосабамі распаўсюджваньня зьвестак, аб яе працах і дасягненьнях: аддзелы дапасаваньня, пака-



зальныя вучасткі, каляктыўныя досьледы, выстаўкі, экскурсыі, лекцыі гутаркі, выдавецкая дзейнасьць, зьезды і інш.

2. Па згадненьню з загадчыкам станцыі, практыкант за час прабываньня на станцыі выконвае самастойную работу, па магчымасьці пабудованую так, каб ён мог дапасоўваць мэтады, як палявы вегэтацыйны, так і хэмічны.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

Горрайлітбел № 88. Зак. № 244—500 экз.